УДК 903.25:739.2(476.5)

# КЛАД ВИСОЧНЫХ КОЛЕЦ ИЗ ГОРОДИЩА БОРОНИКИ (ВИТЕБСК)

***В. Н. ТАРАСЕВИЧ***[1)]***, В. М. ВАСИЛЬЕВ***[2)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*
[2)]*Национальный исторический музей Республики Беларусь, ул. К. Маркса, 12, 220030, г. Минск, Беларусь*

Исследуются два височных кольца, которые являются частью клада из городища Бороники (Витебск) и хранятся в Национальном историческом музее Республики Беларусь. Отсутствие прямых аналогий и обстоятельства нахождения вещей позволили Г. В. Штыхову очень приблизительно датировать этот комплекс, поэтому цель исследования – уточнение датировки клада. Высказано предположение, что это можно сделать на основе анализа стилистических особенностей колец и таким образом очертить круг традиций, которые могли повлиять на их создание. Установлено, что орнаментальные мотивы, использовавшиеся при изготовлении колец из Бороников, были широко распространены в лесной и лесостепной зонах Центральной и Восточной Европы во время Великого переселения народов. Сделан вывод, что кольца можно датировать промежутком времени с конца V до конца VII – начала VIII в. Результаты исследования могут быть использованы в качестве источника для реконструкции женского ювелирного убора населения Белорусского Подвинья второй половины 1-го тыс. н. э.

***Ключевые слова:*** височные кольца; клад; женский убор; трапециевидные подвески; спиральная обмотка; очковидные подвески.

**Образец цитирования:**
Тарасевіч ВМ, Васільеў ВМ. Скарб скроневых кольцаў з гарадзішча Бароніки (Віцебск). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2020;3:64–71.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-3-64-71.

**For citation:**
Tarasevich VN, Vasiliev VM. The hoard of temple rings from the hillfort of Baroniki (Viciebsk). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;3:64–71. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-3-64-71.

**Авторы:**
***Виктория Николаевна Тарасевич*** – аспирантка кафедры археологии и специальных исторических дисциплин исторического факультета. Научный руководитель – доктор исторических наук, профессор А. А. Егорейченко.
***Василий Михайлович Васильев*** – научный сотрудник отдела археологии, нумизматики и оружия.

**Authors:**
***Victoryia N. Tarasevich***, postgraduate student at the department of archeology and special historical disciplines, faculty of history.
*vikinghouse@mail.ru*
*https://orcid.org/0000-0003-2106-1382*
***Vasily M. Vasiliev***, researcher at the department of archeology, numismatics and weaponry.
*vasilyev_mus@mail.ru*

CC BY NC

# СКАРБ СКРОНЕВЫХ КОЛЬЦАЎ З ГАРАДЗІШЧА БАРОНІКІ (ВІЦЕБСК)

***В. М. ТАРАСЕВІЧ[1*], В. М. ВАСІЛЬЕЎ[2*]***

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*
[2*]*Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, вул. К. Маркса, 12, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Даследуюцца два скроневыя кольцы, якія з'яўляюцца часткай рэчавага скарбу з гарадзішча Баронікі (Віцебск) і захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Адсутнасць дакладных аналогій і абставіны знаходкі рэчаў дазволілі Г. В. Штыхаву вельмі прыкладна датаваць гэты комплекс, таму мэта даследавання – удакладненне датавання скарбу. Выказана меркаванне, што гэта можна зрабіць на падставе аналізу стылістычных асаблівасцей кольцаў і такім чынам акрэсліць традыцыі, якія маглі паўплываць на іх стварэнне. Устаноўлена, што арнаментальныя матывы, выкарыстаныя пры вырабе кольцаў з Баронікаў, былі шырока распаўсюджаны ў лясной і лесастэпавай зонах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў часы Вялікага перасялення народаў. Зроблена выснова, што кольцы можна датаваць прамежкам часу ад канца V да канца VII – пачатку VIII ст. Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны як крыніца для рэканструкцыі жаночага ювелірнага ўбору насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы 1-га тыс. н. э.

***Ключавыя словы:*** скроневыя кольцы; скарб; жаночы ўбор; трапецападобныя падвескі; спіральная абмотка; акулярападобныя падвескі.

# THE HOARD OF TEMPLE RINGS FROM THE HILLFORT OF BARONIKI (VICIEBSK)

***V. N. TARASEVICH[a], V. M. VASILIEV[b]***

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*
[b]*National Historical Museum of the Republic of Belarus, 12 Karl Marx Street, Minsk 220030, Belarus*

*Corresponding author: V. N. Tarasevich (vikinghouse@mail.ru)*

The article is devoted to two temple rings, which are a part of the hoard from the hillfort of Baroniki (Viciebsk). Temple rings are now kept in the National Historical Museum of the Republic of Belarus. The absence of direct analogies and the circumstances of finding of things allowed G. V. Shtyhau to date this complex very approximately. Therefore, the aim of the research is to clarify the dating of the hoard. According to the authors, this can be done on the basis of the analysis of the stylistic features of the appearance of the rings and, thus, to identify traditions that could affect their creating. It was established that the «ornamental motifs» used in the making of rings from Baroniki were widespread in the forest and forest steppe zones of Central and Eastern Europe during the Migration Period. Due to this, the rings can be dated from the end of the 5$^{th}$ century to the end of the 7$^{th}$ – beginning of the 8$^{th}$ century. The results of the research can be used as a source for the reconstruction of the women's jewelry attire of the population of the Belarusian Dzvina Region in the second half of the 1$^{st}$ millennium AD.

***Keywords:*** temple rings; hoard; female attire; trapezoidal pendants; spiral winding; eyeglasses-shaped decor.

## Уводзіны

У экспазіцыі Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь (НГМ РБ) выстаўлены два незвычайныя скроневыя кольцы. Яны былі знойдзены ў 1965 г. падчас археалагічных раскопак гарадзішча Баронікі, якія праводзіліся экспедыцыяй Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР пад кіраўніцтвам Г. В. Штыхава і з'яўляюцца часткай скарбу, што складаўся з трох кольцаў. Гарадзішча знаходзіцца за 5 км ад Ніжняга замка ў Віцебску на левым беразе р. Лучосы (мал. 1).

У паўночна-ўсходняй частцы гарадзішча Г. В. Штыхаў заклаў шурф памерам 1 × 1 м, у цэнтры якога «на глыбіні 0,3–0,4 м… пад дзірваном былі знойдзены тры скроневыя кольцы»[1] (тут і далей пераклад наш. – *В. Т.*, *В. В.*). Абставіны знаходкі кольцаў падштурхоўваюць да думкі, што гэта скарб: «Усе тры кольцы ляжалі разам такім чынам, што ў мяне склалася ўражанне аб знаходцы скарбу»[2]. Для высвятлення абставін залягання кольцаў шурф пашырылі да памераў 4 × 4 м. У ім былі выяўлены дзве клінападобныя сякеры, кераміка днепра-дзвінскай культуры, нож з гарбатай спінкай, бочкападобнае праселка і венца гаршка, блізкага да «керамікі з гарадзішча Замкавая гара каля в. Дзядзілавічы на Барысаўшчыне»[3], што належыць да банцараўскай культуры.

[1]*Штыхов Г. В.* Отчет об археологических исследованиях в Витебской области и Логойске в 1965 г. // Центр. науч. арх. Нац. акад. наук Беларуси (ЦНА НАН Беларуси). Фонд археол. науч. документации (ФАНД). Оп. 1. Д. 259. С. 17.
[2]Там же.
[3]Там же. С. 19.




*Мал. 1.* Гарадзішча Баронікі на плане г. Віцебска
*Fig. 1.* Hillfort Baroniki on the plan of Viciebsk

Згодна са справаздачай Г. В. Штыхава, у шурфе не было зафіксавана ніякіх стратыграфічных праслоек, аднак, калі зыходзіць з яго высноў, на гарадзішчы прысутнічаюць два культурна-храналагічныя гарызонты: першы звязаны з днепра-дзвінскай культурай, другі – з керамікай трэцяй чвэрці 1-га тыс. н. э. У справаздачы, на жаль, няма чарцяжоў, якія тычацца гэтага шурфа, таму можна вельмі ўмоўна казаць пра абставіны залягання асобных артэфактаў і іх узаемасувязі. Гэта дазваляе абапірацца на меркаванне Г. В. Штыхава, паводле якога скарб быў схаваны на фінальным этапе існавання гарадзішча, што, аднак, не выключае, што ён мог трапіць туды і пасля спынення актыўнага выкарыстання гарадзішча. Асноўнай праблемай у датаванні дадзенага комплексу якраз і з’яўляецца яго невідавочная сувязь з археалагічным кантэкстам, таму аўтар раскопак вызначыў час яго паходжання вельмі ўмоўна VII–IX стст.

У 1986 г. у фонды НГМ РБ (тады – Дзяржаўны музей БССР) з трох выяўленых кольцаў былі перададзены два (прыняты як дзве адзінкі з уліковымі нумарамі КП 40441/1 (далей – кольца 1) і КП 40441/2 (далей – кольца 2)).

Трэба адзначыць, што гэты скарб ніколі не ўводзіўся ў навуковы ўжытак як цэлы комплекс. Адзін прадмет (кольца 3) быў замаляваны, гэты малюнак прыкладзены да навуковай справаздачы Г. В. Штыхава за 1965 г.[4], ён жа прыведзены ў артыкуле навукоўца за 1966 г. [1, с. 240, рис. 3, *2*]. Малюнак кольца 3 таксама публікаваўся ў энцыклапедыі «Археалогія Беларусі»[5]; фота кольца 1 – у каталозе Дзяржаўнага музея БССР[6], энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі»[7]. Кольцы з Баронікаў згадваюцца ў кнізе В. І. Шадыры [2, с. 68]. У альбоме НГМ РБ апублікаваны выявы кольцаў 1 і 2[8]. Да кольца 2 прымацаваны бі-S-падобны трымальнік з трапецападобнымі падвескамі з іншага помніка (гарадзішча Язна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці).

Такім чынам, у фондах НГМ РБ захоўваюцца два з трох знойдзеных Г. В. Штыхавым кольцы. На мо-

[4]*Штыхов Г. В.* Отчет об археологических исследованиях в Витебской области и Логойске в 1965 г. // Центр. науч. арх. Нац. акад. наук Беларуси (ЦНА НАН Беларуси). Фонд археол. науч. документации (ФАНД). Оп. 1. Д. 259. Рис. 11.
[5]*Штыхаў Г. В.* Баронікі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. Т. 1 / рэдкал.: Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2009. С. 88.
[6]Дзяржаўны музей БССР : каталог / уклад.: І. П. Загрышаў, С. А. Мілючэнкаў. Мінск : Беларусь, 1986. Мал. 38.
[7]*Штыхаў Г. В.* Баронікі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя / рэдкал.: В. В. Гетаў і інш. Мінск, 1993. С. 75.
[8]Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь : альбом / уклад.: Н. У. Калымага, А. І. Ладзісаў. Мінск : А. А. Аляксееў, 2015. С. 88, мал. 62, 63.

мант іх знаходкі прамых аналогій выяўлена не было. У сувязі з гэтым адказаць на пытанні пра этнакультурную прыналежнасць і храналогію скарбу складана. Аднак Г. В. Штыхаў папярэдне аднёс іх да старажытнасцей балтаў[9].

Мы сутыкаемся з наступнай **праблемай**: дадзены комплекс цяжка звязаць з пэўным археалагічным кантэкстам, таму гэта ўскладняе яго датаванне. Адсутнасць прамых аналогій не дазваляе надзейна адносіць гэтыя кольцы да нейкай культурнай традыцыі.

**Мэтай** даследавання з'яўляецца ўдакладненне датавання скарбу скроневых кольцаў з гарадзішча Баронікі. Аўтары ставяць перад сабой **задачу** на падставе стылістычных асаблівасцей акрэсліц кола традыцый, якія маглі паўплываць на выгляд кольцаў, што, у сваю чаргу, дапаможа больш дакладна іх датаваць.

Скарб скроневых кольцаў з гарадзішча Баронікі дазваляе пашырыць базу крыніц па жаночых упрыгажэннях другой паловы 1-га тыс. н. э. Дадзеныя кольцы змешчаны ў экспазіцыі «Старажытная Беларусь» НГМ РБ, у вітрыне, прысвечанай жалезнаму веку. Вынікі даследавання будуць карыснымі пры ўдакладненні атрыбуцыі прадметаў і карэкцыі экспазіцыі музея. Уведзеныя ў навуковы ўжытак звесткі пра кольцы з'яўляюцца крыніцай для рэканструкцыі жаночага строю насельніцтва Беларускага Падзвіння другой паловы 1-га тыс. н. э.

## Вынікі і іх абмеркаванне

Кольцы маюць просты, але арыгінальны выгляд (мал. 2). Яны аднолькавыя па стылі і памеры, адзінае адрозненне паміж імі – гэта «арыентацыя» замкоў: у двух кольцаў правы замок, у аднаго – левы. Кольцы зроблены з суцэльнага дроту рознага дыяметру і сячэння: дужка – з круглага ў сячэнні дроту, які па-




*Мал. 2.* Кольцы з гарадзішча Баронікі.
Кольца 1 (*а*): *1* — вонкавы бок, *2* — унутраны бок;
кольца 2 (*б*): *1* — вонкавы бок, *2* — від збоку, *3* — унутраны бок

*Fig. 2.* Temple rings from hillfort Baroniki.
Temple ring 1 (*a*): *1* — outer side, 2 — inner side;
temple ring 2 (*b*): *1* — outer side, *2* — a view from a side, *3* — inner side

[9]*Штыхов Г. В.* Отчет об археологических исследованиях в Витебской области и Логойске в 1965 г. С. 19.

танчаецца і ўтварае акулярападобнае ўпрыгажэнне. Далей дрот у папярочным сячэнні набліжаны да трохвугольніка, яго канцом абматана амаль трацiна дужкі. Другі канец дужкі загнуты кручком і выконвае функцыю замка разам з адной адтулінай акулярападобнага дэкору. Іншы канец дужкі таксама абматаны дротам, але большай колькасцю віткоў. На тоўстай частцы дроту заўважныя падоўжныя барозны. У акулярападобным дэкоры ўнізе кольцаў замацаваны трапецападобныя падвескі.

*Кольца 1* (гл. мал. 2, *а*) мае вышыню 61,3 мм, шырыню – 50,6 мм; памеры левай спіралі – 19,7 × 19,9 мм (3 віткі), правай – 12,1 × 13,0 мм (3 віткі). Памеры правага кольца для падвешвання трапецападобнай падвескі – 11,6 × 12,7 × 1,5 мм, левага – 12,0 × 13,0 × × 1,5 мм. У сячэнні дрот кольцаў для падвешвання трапецападобных падвесак сплошчаны, уздоўж яго ідзе баразна (магчыма, ад працягвання праз валачыла). Кольцы для падвескі авальнай формы, яны закручаны прыблізна ў паўтара абароту.

Дыяметр дроту на дужцы зверху – 3 мм. Вышыня левай трапецападобнай падвескі – 41 мм, шырыня яе верхняй часткі – 7,9 мм, ніжняй – 32,5 мм. Вышыня правай трапецападобнай падвескі – 32,3 мм, шырыня яе верхняй часткі – 8 мм, ніжняй – 33,5 мм. Таўшчыня падвесак – 0,4 мм, у верхняй частцы маюцца адтуліны авальнай формы. У верхнім краі, каля адтуліны, трапецападобная падвеска мае «завальцоўку» (загнуты і заплюшчаны верхні край, які рабіўся для большай трываласці падчас выкарыстання). Ніжнія вуглы трапецый скругленыя.

*Кольца 2* (гл. мал. 2, *б*) мае вышыню 58,2 мм, шырыню – 42,5 мм; памеры левай спіралі – 17,9 × 15,2 × × 1,5 мм (4 віткі дроту), правай – 14,3 × 14,0 × 2,0 мм (3 віткі дроту). Дыяметр дроту на дужцы зверху – 2,7 мм.

*Кольца 3* таксама мае дзве трапецападобныя падвескі (мал. 3). Выявіць месца яго захавання пакуль не атрымалася.

Кольцы да моманту захавання доўгі час былі ва ўжытку. На іх у акулярападобным дэкоры кожнай спіралі ўнізе маецца заўважная «перацёртасць» дроту. На верхняй дужцы ў кожнага з прадметаў ёсць дзве паралельныя адна адной «баразёнкі» (гл. мал. 2).

У шэрагу публікацый кольцы датуюцца па-рознаму: V–IV стст. да н. э. – у каталозе Дзяржаўнага музея БССР, першай паловай 1-га тыс. н. э. – у альбоме НГМ РБ. У навуковай справаздачы Г. В. Штыхаў адзначаў, што, на думку літоўскіх і латышскіх калег, датаваць гэтыя ўпрыгажэнні магчыма VII–IX стст.[10] У пазнейшых публікацыях даследчык схіляўся да больш вузкіх рамак і суадносіў час з’яўлення гэтых кольцаў з перыядам узнікнення помнікаў ты-



*Мал. 3.* Кольца 3 з гарадзішча Баронікі.
К р ы н і ц а: навуковая справаздача Г. В. Штыхава[11]
*Fig. 3.* Temple ring 3 from hillfort Baroniki.
S o u r c e: scientific report by G. V. Shtyhau

пу селішчаў Дзядзілавічы, Калочын і ніжняга слоя Віцебска [1, с. 247].

Падводзячы вынікі сваіх даследаванняў на Бароніках у 2006 г., Г. В. Штыхаў адзначыў наяўнасць трох асноўных керамічных традыцый на гарадзішчы: днепра-дзвінскай, культуры штрыхаванай керамікі і, магчыма, «“познезарубінецкай” у тэрміналогіі Л. Д. Побаля» [3]. У трэцяй чвэрці 1-га тыс. н. э. гарадзішча выкарыстоўвалася ў якасці сховішча, і прыкладна ў гэты час ці некалькі пазней на пляцоўку гарадзішча трапіў скарб са скроневых кольцаў [3].

У энцыклапедычных артыкулах, прысвечаных гарадзішчу Баронікі, Г. В. Штыхаў датуе скарб VI–VII ці VI–VIII стст.[12] (аднак у подпісе пад фотаздымкам кольца стаіць дата V–IV стст. да н. э.).

Да другой паловы 1-га тыс. н. э. адносіць скроневыя кольцы з Баронікаў В. І. Шадыра, вылучаючы іх у групу III. Даследчык лічыць, што стылістычна гэтыя прадметы нагадваюць серпападобныя скроневыя кольцы з падвескамі культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў (КСПДК) [2, с. 68].

На сённяшні момант, нягледзячы на спадзяванне Г. В. Штыхава, які меркаваў, што пошук аналогій кольцам з Баронікаў – справа часу, прамыя аналогіі пакуль невядомыя. Такім чынам, пытанне датавання кольцаў застаецца без адказу. Таму аўтары

[10]*Штыхов Г. В.* Отчет об археологических исследованиях в Витебской области и Логойске в 1965 г. Рис. 19.
[11]Там же. Рис. 11.
[12]*Штыхаў Г. В.* Баронікі // Археалогія і нумізматыка Беларусі. Мінск, 1993. С. 75 ; *Штыхаў Г. В.* Баронікі // Археалогія Беларусі. Т. 1. Мінск, 2009. С. 88.

звярнуліся да стылістычных і канструктыўных асаблівасцей кольцаў як магчымага шляху пошуку аналогій.

***Спіральная абмотка дужкі кольцаў побач з акулярападобным дэкорам.*** Нягледзячы на тое што спіраль – вельмі папулярны арнаментальны матыў, бліжэйшымі магчымымі аналогіямі можна лічыць скроневыя кольцы, характэрныя для «старажытнасцей антаў» групы І (кольцы з плоскай спіраллю, загнутай унутр), і кольцы з пахаванняў культуры ўсходнелітоўскіх курганоў. Узмацняе тыпалагічную роднасць кольцаў з Сярэдняга Падняпроўя і з помнікаў культуры ўсходнелітоўскіх курганоў наяўнасць «нефункцыянальнага» элемента – абмоткі з тонкай металічнай паласы каля спіралі, як, напрыклад, у кольца з г. Дусетаса. Такія кольцы датуюцца канцом IV – пачаткам V ст. [4, p. 161, pav. 62].

Падобная абмотка ёсць каля спіральных заканчэнняў і на кольцах з Баронікаў. Спіральная абмотка краёў сустракаецца і на грыўнях, у прыватнасці на грыўні з гарадзішча Вежкі (Дубровенскі раён Віцебскай вобласці)[13] і на грыўні, якая паходзіць з Гапонаўскага скарбу [5, с. 78, рис. 11, *7*; 6, с. 190, рис. 16].

Арнаментальны матыў, блізкі да акулярападобнага дэкору ўнізе на кольцах з Баронікаў, можна заўважыць у двухспіральных акулярападобных упрыгажэннях, да якіх у некаторых выпадках маглі мацавацца трапецападобныя падвескі розных тыпаў. Да разгляду ўпрыгажэнняў з такім дэкорам звярталіся І. А. Гаўрытухін, А. А. Егарэйчанка, Д. Елінкова, В. Е. Радзінкова [6–9].

Існуе два варыянты двухспіральных упрыгажэнняў. Першы – акулярападобныя падвескі, якія маглі быць упрыгажэннем галавы, але, хутчэй за ўсё, ўваходзілі ў склад караляў [6, с. 49]. Такія падвескі маюцца ў складзе скарбаў «старажытнасцей антаў» групы І (Гапонаўскі, Мартынаўскі скарбы), а таксама на тэрыторыі Сярэдняга Падняпроўя і Цэнтральнай Еўропы. Другі варыянт – двухспіральныя падвескі кшталту знойдзенай у грунтовым могільніку Тумяны (Рэспубліка Польшча) у пахаванні 30 [10, с. 322, рис. 19]. Комплекс з гэтага пахавання па пальчатых фібулах магчыма датаваць VII ст. [11, с. 46–48]. Падобныя падвескі знойдзены на паселішчах Растокі (Чэшская Рэспубліка), Гроспруфенінг (Федэратыўная Рэспубліка Германія), Келяры (Рэспубліка Польшча) [8, с. 391, рис. 1, *3*, *4*]. На тэрыторыі Беларусі такія падвескі выяўлены на гарадзішчы Новае Сяло (Сенненскі раён Віцебскай вобласці), на селішчы Зазоны (Браслаўскі раён Віцебскай вобласці)[14] [12, фото 38]. Хутчэй за ўсё, такія падвескі таксама ўваходзілі ў склад караляў [13, s. 676, rys. 5].

Такім чынам, спіральная абмотка дужкі кольцаў побач з акулярападобным дэкорам у кольцах з Баронікаў стылістычна набліжана да групы І «старажытнасцей антаў» . Часам выпадзення скарбаў групы І «старажытнасцей антаў» лічыцца другая – трэцяя чвэрць VII ст., а часам фарміравання жаночага ўбору, прадстаўленага ў гэтых скарбах, – канец VI – першая палова VII ст. [14, с. 246–247]. Другі вектар пошуку магчымых аналогій – гэта тэрыторыя Цэнтральнай Еўропы, дзе двухспіральныя акулярападобныя ўпрыгажэнні датуюцца VI–VII стст.

***Трапецападобныя падвескі.*** Такі элемент упрыгажэнняў вельмі распаўсюджаны і папулярны на тэрыторыі лясной зоны Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Прататыпы трапецападобных падвесак можна знайсці ў зарубінецкай культуры і на тэрыторыі сучаснай Літвы. Для пазнейшага часу (VI–VII стст.) такія падвескі распаўсюдзіліся надзвычайна шырока, ад Верхняй Волгі на паўночным усходзе да сярэдняга Падунаўя на захадзе, у асяроддзі розных этнічных груп: балтаў, фіна-ўграў, славян; яны выяўлены на могільніках Аварскага каганата і германскага круга [8, с. 396].

Трапецападобныя падвескі з Баронікаў неарнаментаваныя, па форме набліжаюцца да трохвугольніка. Неарнаментаваная падвеска падобнай формы была знойдзена на селішчы каля гарадзішча Дзядзілавічы (Замкавая гара), якое датуецца трэцяй чвэрцю 1-га тыс. н. э.[15] Аналогіі падобным падвескам можна знайсці ў культуры разанска-окскіх курганоў, у мошчынскай культуры, на постгунскіх помніках Верхняга Падоння [15, с. 231, рис. 3, *25–27*; 16, с. 236, рис. 5, *3*, с. 245, рис. 14, *4*; 17, с. 157; 18, с. 298]. Датуюцца такія падвескі шырока: V – пачаткам VII ст. [16, с. 225].

Нягледзячы на іншыя прапорцыі, падвескі з Баронікаў нагадваюць трапецападобныя падвескі КСПДК. Трапецыі гэтай культуры маюць характэрны элемент – «завальцоўку». На падвесках V–VII стст. аўтары гэтай дэталі не заўважылі.

Наяўнасць трапецападобных падвесак на кольцах – з’ява не вельмі частая. Скроневыя кольцы з трапецападобнымі падвескамі бытавалі ў асяродку носьбітаў культуры КСПДК. Але такія кольцы маюць вялікія адрозненні як у тэхналогіі, так і ў знешнім выглядзе. Цікава, што кольцы з Баронікаў і кольцы КСПДК паходзяць з геаграфічна блізкага рэгіёна. Нельга сцвярджаць, што кольцы з Баронікаў – тыпалагічны папярэднік больш позніх кольцаў, але магчыма, што іх вытворцы знаходзіліся пад уплывам падобных эстэтычных традыцый, карані якіх варта шукаць у лясной зоне Усходняй Еўропы.

[13] *Каласоўскі Ю. У.* Вежкі // Археалогія Беларусі. Т. 1. Мінск, 2009. С. 153–154.

[14] Прадмет знаходзіцца ў экспазіцыі вучэбнай лабараторыі музейнай справы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

[15] *Митрофанов А. Г.* Раскопки в 1962 г. городища и селища на «Замковой горе». Борисовский район // ЦНА НАН Беларуси. ФАНД. Д. 147. 20 с. + 12 с. ил.

## Заключэнне

Відавочна, што спроба пошуку аналогій, заснаваная толькі на знешнім падабенстве цэлых прадметаў ці іх элементаў, не можа лічыцца дакладным і бясспрэчным спосабам доказу тыпалагічнай блізкасці. Аднак, нягледзячы на тое што тоесныя арнаментальныя матывы ці нейкія знешнія элементы ўпрыгажэнняў маглі з'яўляцца незалежна адно ад аднаго, а эстэтычныя погляды і ювелірныя тэхналогіі развівацца канвергентна, часта здараецца так, што для пэўных эпох на вялікіх тэрыторыях існуе своеасаблівы стыль ці мода. На падставе аналізу стылістычных асаблівасцей кольцаў з гарадзішча Баронікі можна сказаць, што арнаментальныя матывы, выкарыстаныя пры іх вырабе, былі шырока распаўсюджаны ў лясной і лесастэпавай зонах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ў часы Вялікага перасялення народаў. Гэта падабенства можа наблізіць да адказу на пытанне пра магчымую храналогію ўзнікнення скарбу: папярэдне гэта прамежак часу ад канца V да канца VII – пачатку VIII ст.

Адсутнасць прамых аналогій кольцам з Баронікаў можа быць звязана з асаблівасцямі археалагічных крыніц культур Верхняга Падняпроўя і Падзвіння трэцяй чвэрці 1-га тыс. н. э. У матэрыялах паселішчаў гэтага часу ўпрыгажэнні прадстаўлены адзінкавымі знаходкамі ці ў складзе скарбаў. Пахаванні звычайна безынвентарныя. На тэрыторыі Верхняга Падняпроўя і Падзвіння скроневыя кольцы сустракаюцца ў складзе скарбаў (напрыклад, Клішына, Дзямідаўка, Вежкі). Кольцы з Баронікаў пашыраюць уяўленні пра жаночы ювелірны ўбор трэцяй чвэрці 1-га тыс. н. э.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Штыхов ГВ. Сравнительное изучение древнейших городов Полоцкой земли и памятников их окрестностей. В: Исаенко ВФ, редактор. *Древности Белоруссии. Материалы конференции по археологии Белоруссии и смежных территорий (1966 г.)*. Минск: Академия наук БССР; 1966. с. 238–252.

2. Шадыра ВІ. *Беларускае Падзвінне (І тысячагоддзе н. э.)*. Мінск: Інстытут гісторыі НАН Беларусі; 2006. 150 с.

3. Штыхаў ГВ. Вынікі даследавання гарадзішча Баронікі пад Віцебскам. *Гістарычна-археалагічны зборнік*. 2007; 23:231.

4. Tautavičius A. *Vidurinis geležies amžius Lietuvoje (V–IX a.)*. Vilnius: Lietuvos pilys; 1996. 376 p.

5. Обломский АМ. Колочинская культура. В: Обломский АМ, Исланова ИВ, редакторы. *Раннесредневековые древности лесной зоны Восточной Европы (V–VII вв.)*. Москва: Институт археологии РАН; 2016. с. 10–113.

6. Гавритухин ИО, Обломский АМ. *Гапоновский клад и его культурно-исторический контекст*. Москва: Институт археологии РАН; 1996. 297 с.

7. Егорейченко АА. Очковидные подвески на территории СССР. *Советская археология*. 1991;2:171–181.

8. Елинкова Д. К изучению женских украшений из могильника с трупосожжениями Пржитулки культуры с керамикой пражского типа. В: Синика ВС, Рабинович РА, редакторы. *Древности. Исследования. Проблемы. Сборник статей в честь 70-летия Н. П. Тельнова*. Кишинев: Приднестровский государственный университет имени Т. Г. Шевченко; 2018. с. 389–407.

9. Родинкова ВЕ. К проблеме выделения балтских элементов в женском уборе «мартыновского» типа. *Краткие сообщения Института археологии*. 2015;240:91–108.

10. Кулаков ВИ. Идентификация находок I–VII вв. из музея «Пруссия», хранящихся в фондах Калининградского областного историко-художественного музея. В: Обломский АМ, редактор. *Проблемы взаимодействия населения Восточной Европы в эпоху Великого переселения народов*. Москва: Институт археологии РАН; 2014. с. 299–340.

11. Гавритухин ИО. Маленькие трапециевидные подвески с полоской из прессованных точек по нижнему краю. *Гістарычна-археалагічны зборнік*. 1997;12:43–58.

12. Подгурский ПН. Археологические исследования в Новом Селе (предварительные результаты). В: Левко ОН, Белевец ВГ, редакторы. *Славяне на территории Беларуси в догосударственный период. Книга 2*. Минск: Беларуская навука; 2016. с. 263–270.

13. Rudnicki M. Zawieszki trapezowate z terenu grupy olsztyńskiej – świadectwo kontaktów ze Słowianami? In: Beljak J, Březinová G, Varsik V, editori. *Archeológia barbarov 2009. Hospodárstvo Germánov. Sídliskové a ekonomické štruktúry od neskorej doby laténskej po včasný stredovek. Zborník referátov z V. protohistorickej konferencie; 21–25 septembra 2009; Nitra, Slovensko*. Nitra: Instituti Archaeologici Nitriensis Academiae Scientiarum Slovacae; 2010. s. 669–686.

14. Родинкова ВЕ. Женский костюм днепровских племен в эпоху Великого переселения народов: современное состояние исследований. В: Родинкова ВЕ, редактор. *Новые исследования по археологии стран СНГ и Балтии. Материалы школы молодых археологов; 3–12 сентября 2011 г.; Кириллов, Россия*. Москва: Институт археологии Российской академии наук; 2011. с. 239–265.

15. Белоцерковская ИВ. Женский костюм окских финнов V–VII вв. Традиции и новации. В: Обломский АМ, редактор. *Проблемы взаимодействия населения Восточной Европы в эпоху Великого переселения народов*. Москва: Институт археологии РАН; 2014. с. 184–235.

16. Воронцов АМ. Памятники мощинской культуры в третьей четверти I тыс. н. э. В: Обломский АМ, Исланова ИВ, редакторы. *Раннесредневековые древности лесной зоны Восточной Европы (V–VII вв.)*. Москва: Институт археологии РАН; 2016. с. 221–260.

17. Обломский АМ. Могильник гуннского времени Ксизово-19. Острая Лука Дона в древности. В: Обломский АМ, редактор. *Археологический комплекс памятников гуннского времени у с. Ксизово (конец IV – V в.)*. Москва: Институт археологии РАН; 2015. с. 134–165.

18. Обломский АМ. Этнические и социальные компоненты населения Острой Луки Дона в гуннское время (вместо заключения). В: Обломский АМ, редактор. *Археологический комплекс памятников гуннского времени у с. Ксизово (конец IV – V в.)*. Москва: Институт археологии РАН; 2015. с. 296–309.

## References

1. Shtykhov GV. [A comparative study of the ancient cities of Polack Land and the monuments of their surroundings]. In: Isaenko VF, editor. *Drevnosti Belorussii. Materialy konferentsii po arkheologii Belorussii i smezhnykh territorii (1966)* [Antiquities of Belarus. Materials of the conference on archaeology of Belarus and neighboring territories (1966)]. Minsk: Academy of Sciences of the BSSR; 1966. p. 238–252. Russian.

2. Shadyra BI. *Belaruskae Padzvinne (I tysjachagoddze n. je.)* [Belarusian Dvina Region (the second half of the 1$^{st}$ millennium AD)]. Minsk: Institute of History, National Academy of Sciences of Belarus; 2006. 150 p. Belarusian.

3. Shtyhau GV. [The results of the study of the Baroniki hillfort near Viciebsk]. *Gistarychna-arhealagichny zbornik*. 2007;23:231. Belarusian.

4. Tautavičius A. *Vidurinis geležies amžius Lietuvoje (V–IX a.)*. Vilnius: Lietuvos pilys; 1996. 376 p.

5. Oblomskii AM. [Kolochin culture]. In: Oblomskii AM, Islanova IV, editors. *Rannesrednevekovye drevnosti lesnoi zony Vostochnoi Evropy (V–VII vv.)* [Early medieval antiquities of the forest zone of Eastern Europe (5$^{th}$–7$^{th}$ centuries)]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2016. p. 10–113. Russian.

6. Gavritukhin IO, Oblomskii AM. *Gaponovskii klad i ego kul'turno-istoricheskii kontekst* [Gaponovsky hoard and its cultural and historical context]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 1996. 297 p. Russian.

7. Egoreichenko AA. [Ocular-shaped pendants on the territory of the USSR]. *Sovetskaya arkheologiya.* 1991;2:171–181. Russian.

8. Jelinkova D. [On the issue of some female adornments from a cremation cemetery of the Prague-type pottery culture in Přítluky]. In: Sinika VS, Rabinovich RA, editors. *Drevnosti. Issledovaniya. Problemy. Sbornik statei v chest' 70-letiya N. P. Tel'nova* [Antiquities. Research. Problems. Collection of articles in honor of the 70$^{th}$ unniversary of N. P. Telnov]. Chisinau: Transnistrian State University named after T. G. Shevchenko; 2018. p. 389–407. Russian.

9. Rodinkova VE. On the problem of identification of the Balts elements in the female jewelry set of the Martynovka type. *Kratkie soobscheniya Instituta arheologii.* 2015;240:91–108. Russian.

10. Kulakov VI. [Identification of finds of the 1$^{st}$–7$^{th}$ centuries from the Museum «Prussia» stored in the funds of the Kaliningrad Regional Museum of History and Art]. In: Oblomskii AM, editor. *Problemy vzaimodeistviya naseleniya Vostochnoi Evropy v epokhu Velikogo pereseleniya narodov* [Problems of interaction of the population of Eastern Europe during the Great Migration]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2014. p. 299–340. Russian.

11. Gavritukhin IO. [Small trapezoid pendants with a strip of pressed dots along the bottom edge]. *Gistarychna-arhealagichny zbornik*. 1997;12:43–58. Russian.

12. Podgurskii PN. [Archaeological researches in Novoye Selo (preliminary results)]. In: Levko ON, Beliavets VG, editors. *Slavyane na territorii Belarusi v dogosudarstvennyi period. Kniga 2* [Slavs on the territory of Belarus in the pre-state period. Volume 2]. Minsk: Belaruskaja navuka; 2016. p. 263–270. Russian.

13. Rudnicki M. Zawieszki trapezowate z terenu grupy olsztyńskiej – świadectwo kontaktów ze Słowianami? In: Beljak J, Březinová G, Varsik V, editori. *Archeológia barbarov 2009. Hospodárstvo Germánov. Sídliskové a ekonomické štruktúry od neskorej doby laténskej po včasný stredovek. Zborník referátov z V. protohistorickej konferencie; 21–25 septembra 2009; Nitra, Slovensko.* Nitra: Instituti Archaeologici Nitriensis Academiae Scientiarum Slovacae; 2010. s. 669–686.

14. Rodinkova VE. [Women's costume of the Dnieper tribes in the era of the Great Migration: the current state of research]. In: Rodinkova VE, editor. *Novye issledovaniya po arkheologii stran SNG i Baltii. Materialy Shkoly molodykh arkheologov; 3–12 sentyabrya 2011 g.; Kirillov, Rossiya* [New research on archeology of the CIS and Baltic countries. Materials of the School of Young Archaeologists; 2011 September 3–12; Kirillov, Russia]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2011. p. 239–265. Russian.

15. Belotserkovskaya IV. [Women's costume of the Oka Finns of the 5$^{th}$–7$^{th}$ centuries. Traditions and innovations]. In: Oblomskii AM, editor. *Problemy vzaimodeistviya naseleniya Vostochnoi Evropy v epokhu Velikogo pereseleniya narodov* [Problems of interaction between the population of Eastern Europe during the Great Migration]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2014. p. 184–235. Russian.

16. Vorontsov AM. [The sites of Moshchinskaya culture in the third quarter of the 1$^{st}$ millennium AD]. In: Oblomskii AM, Islanova IV, editors. *Rannesrednevekovye drevnosti lesnoi zony Vostochnoi Evropy (V–VII vv.)* [Early medieval antiquities of the forest zone of Eastern Europe (5$^{th}$– 7$^{th}$ centuries)]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2016 p. 221–260. Russian.

17. Oblomskii AM. [Cemetery of the Hunnic time Ksizovo-19. Ostraya Luka of Don in antiquity]. In: Oblomskii AM, editor. *Arkheologicheskii kompleks pamyatnikov gunnskogo vremeni u s. Ksizovo (konets IV – V v.)* [The archaeological complex of sites of the Hunnic time near the village Ksizovo (end of 4$^{th}$ – 5$^{th}$ century)]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2015. p. 134–165. Russian.

18. Oblomskii AM. [Ethnic and social components of the population of Ostraya Luka of Don in the Hunnic time (instead of conclusion)]. In: Oblomsky AM, editor. *Arkheologicheskii kompleks pamyatnikov gunnskogo vremeni u s. Ksizovo (konets IV – V v.)* [The archaeological complex of monuments of the Hunnic time near the village Ksizovo (end of 4$^{th}$ – 5$^{th}$ century)]. Moscow: Institute of Archeology, Russian Academy of Sciences; 2015. p. 296–309. Russian.

*Статья поступила в редколлегию 04.11.2019.*
*Received by editorial board 04.11.2019.*